| 8. | Акции «Чудеса на «Рождество» | Декабрь-январь |
| 9. | Благотворительная акция «Крышечки в обмен на жизнь» | На протяжении реализации проекта |
| 10. | Участие в районном концерте ко Дню пожилых людей «С теплотой в сердце». | декабрь |
| 11. | Конкурс буклетов и плакатов «Берегите землю». | февраль |
| 12. | Участие в зональном этапе конкурсе «Вясёлкавы карагод» | март |
| 13. | Экологическая акция-конкурс «Домик для скворушки». | апрель |
| 14. | Акция «Ветеран живёт рядом» | май |
| 15. | Акция (изготовление сувениров) «Подарок ветерану» | май |
| 16. | В рамках акции «Ветеранам наше уважение» акция «Уютный двор». | Апрель-май |
| 17. | Участие в благотворительном концерте «Журавлик надежды» в санатории «Плисса». | июнь |
| 18. | Благотворительная акция «Спасительная вишенка». | июль |
| 19. | Подведение итогов работы проекта. Презентация проекта. | август |

Не надо много говорить и думать, как улучшить мир. А нужно просто взять и сделать хотя бы один добрый и хороший поступок и самим создать условия, в которых мы хотим жить - основное правило каждого участника проекта «Дарите людям доброту». Делая добрые дела, каждый участник

проекта должен осознать, что добрые дела делать просто: стоит только захотеть.

За один год нельзя научить детей быть милосердными, но принимая участие в подобных проектах, дети получают возможность научиться простому человеческому общению друг с другом, заботе о ближнем, добросердечности, отзывчивости и состраданию. Анализируя результаты проекта, стало ясно, что дети с большим интересом включаются в различные виды деятельности, проявляют чувство ответственности за себя и других, радуются своим победам. Подобная совместная проектная деятельность детей педагога, родителей создаёт ситуацию успеха, радости, удовлетворения, способствует формированию у детей положительной самооценки и комфортного психологического состояния. Полученный эмоциональный заряд служит стимулом для дальнейших действий, открывает горизонты творчества.







**РЕАЛИЗАЦИЯ ПРОЕКТА**

**Благотворительный концерт «Лучики надежды»**







**Благотворительный концерт «Ангелы спускаются с небес»(санаторий «Плисса»**




**«Ангелы спускаются с небес»**



## Творчы праект «Малой радзіме прысвячаецца…»

*Місевіч Святлана Сяргееўна,педагог-арганізатар*
*Юргель Рагнеда Мікалаеўна,педагог-арганізатар*

**Уводзіны**

У беларускім фальклоры ёсць паданне пра бяздоннае багацце. Не існуе скарбніцы, дзе можна было б яго схаваць, і наўрад ці знойдзецца на свеце чалавек, здольны падлічыць яго каштоўнасць. Багацце гэта – сама зямля. Кожны з нас ад самага нараджэння нясе дарагі ўспамін пра бацькоўскі дом, адкуль пачаўся такі доўгі і непрадказальны жыццёвы шлях. Мы называем гэты куточак малой радзімай, быцам падкрэсліваем, што тут – наш выток, наша калыска і наша сэрца. Па дарогах Бацькаўшчыны можна ісці з заплюшчанымі вачыма.



Конкурсная фотография.

Знаёмы не толькі кожны сустрэчны чалавек, але нават дамы, дрэвы, рачулка пад драўлянай спіною маста, камень пры дарозе, белая вежа храма, што губляецца сярод ранішняга туману…

Усё гэта падаецца звыклым, утульным і нязменным. Але ці так гэта на самай справе? Што магло быць раней? Якімі бачыў гэтыя краявіды твой бацька, дзед ці зусім безымянны прашчур? І калі чалавек задае сабе такое пытанне, перад ім адкрываецца іншы сусвет. Далёкі па часе, але важны адчуваннем пераемнасці і садалучанасці да нечага намнога большага, чым адно асабістае жыццё. «Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына…» – пісаў класік. Спадчына. Скарб. Багацце, якое захочаш захаваць і прымножыць.

Глыбоцкі раён вабіць вандроўніка цікавымі гісторыямі. Тут можна пашукаць «Цэнтр Еўропы», адпачыць на беразе самага глыбокага возера Беларусі, палюбавацца на храмы і гарадскія скульптуры. Але каштоўнасці Глыбоччыны куды больш разнастайныя. Культурны пласт захоўвае звесткі пра ўнікальныя прыродныя і рукатворныя аб'екты, знакамітых землякоў, узоры мастацтва і творчага таленту, народныя звычаі, абрады і сучасныя праекты.

Абапіраючыся на вышэй сказанае ў 2019 - 2020 гадах аддзелам па адукацыі Глыбоцкага райвыканкама,грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь», раённым камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, ДУДА «Цэнтр

дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна” быў распрацаваны праект «Малой радзіме прысвячаецца…».

*Мэтай праекта:* стварэнне эфектыўных умоў патрыятычнага выхавання, фарміраванне сацыяльна актыўнай, гарманічнай і творчай асобы, якая спрыяе захаванню і развіццю культуры, звычаяў, традыцый малой радзімы.

Для рэалізацыі задумы. акрэслены наступныя задачы:

- Далучаць жыхароў раёна да гісторыка-культурных і прыродных каштоўнасцей малой радзімы;
- Фарміраваць каштоўнасныя арыенціры, гонар і павагу да гісторыі і культуры свайго краю праз вывучэнне матэрыяльнай і духоўнай спадчыны рэгіёна;
- Садзейнічаць фарміраванню грамадзянска-патрыятычных пачуццяў, адказнасці за адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны;
- Папулярызаваць мясцовыя помнікі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ў грамадстве;
- Заахвочваць супрацоўніцтва ў даследаванні сваёй вёскі, горада, развіваць усведамленне сваёй значнасці ў развіцці роднага краю;
- Спрыяць пашырэнню і паглыбленню ўяўленняў аб выдатных мясцінах малой радзімы, аб яе мінулым і сучасным грамадскім жыцці.

Праект распрацаваны такім чынам, каб ахапіць тры глабальныя кірункі выхаваўчай працы: моладзь, творчасць, садружнасць.

На працягу 2019-2020гг. напрацягу двух гадоў удзельнікі праекта - выхаванцы ўстаноў дашкольнай адукацыі, навучэнцы ўстаноў дадатковай і агульнай сярэдняй адукацыі, педагагічныя работнікі, бацькі вучняў, члены грамадскіх аб’яднанняў прымуць удел у шэрагу мерапрыемстваў па складзеным плане. План мерапрыемстваў прапануе розныя кірункі самавыяўлення.

*Удзельнікі праекта:*

- выхаванцы ўстаноў дашкольнай адукацыі, навучэнцы ўстаноў дадатковай і агульнай сярэдняй адукацыі, педагагічныя работнікі, бацькі вучняў, члены грамадскіх аб’яднанняў.

*Тэрмін рэалізацыі праекта :*

Студзень 2019 года-снежань 2020г.

*Этапы рэалізацыі праекта:*

1 этап падрыхтоўча-арганізацыйны:

- распрацоўка праекта.

2 этап – практычны:

- рэалізацыя асноўных напрамкаў дзейнасці па рабоце праекта;

3 этап заключны:
- падвядзенне вынікаў праекта.

Месца рэалізацыі:
Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна».

Пажаданыя вынікі:
-заахвочванне настаўнікаў і вучняў да рэалізацыі канкрэтных спраў на карысць роднай краіны і яе жыхароў, прапаганда інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу.

План мерапрыемстваў праекта «Малой Радзіме прысвячаецца…»

| № п/п | Мерапрыемства | Час правядзення | Удзельнікі |
|---|---|---|---|
| 1. | Адкрыццё праекта | студзень 2019 года | педагогі, вучні, бацькі, члены грамадскіх аб'яднанняў |
| 2. | Марафон карысных ідэй і спраў «Тут Радзімы маёй пачатак» | студзень 2019 года – снежань 2020 года | педагогі, вучні, бацькі, члены грамадскіх аб'яднанняў |
| 3. | Выстава-конкурс навукова-метадычных матэрыялаў і педагагічнага вопыту ў рамках Года малой радзімы | студзень – люты 2019 года | педагогі |
| 4. | Конкурс «Спадчына малой радзімы. Глыбоччына ў мініяцюры” | сакавік 2019 года | педагогі, вучні, бацькі |
| 5. | Конкурс фотаздымкаў «У аб'ектыве – родны край» | люты – жнівень 2019 года | педагогі і вучні, бацькі |
| 6. | Агляд-конкурс творчых калектываў устаноў адукацыі «Адукацыя. Творчасць. Талент» | май 2019 года | педагогі, вучні, члены грамадскіх аб'яднанняў |
| 7. | Інтэлектуальна-творчая гульня для педагогаў «Педагагічны квіз» | кастрычнік 2019 года | педагогі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8. | Творчы конкурс літаратурных работ «Бацькаўшчына светлая мая» | лістапад 2019 года | педагогі і вучні, бацькі |
| 9. | Працоўная акцыя «На крылах дабра і міласэрнасці» | верасень 2019 года – студзень 2020 года | педагогі, вучні, члены грамадскіх аб’яднанняў |
| 10. | Конкурс малюнкаў «Краявіды малой радзімы» | красавік 2020 года | педагогі і вучні |
| 11. | Працоўная акцыя «Пасадзі дрэва там, дзе нарадзіўся» | красавік – кастрычнік 2020 года | педагогі і вучні, бацькі |
| 12. | Конкурс мультыплікацыйных фільмаў, выкананых сродкамі праграмы СКРЭТЧ | май 2020 года | Педагогі і вучні |
| 1 3. | Конкурс відэаролікаў «Маленькі куточак вялікай Радзімы» | верасень – лістапад 2020 года | педагогі і вучні |
| 14. | Працоўная акцыя «Прыгожы куточак маленькай радзімы» | верасень – лістапад 2020 года | педагогі, вучні, члены грамадскіх аб’яднанняў |
| 15. | Літаратурна-музычная праграма «Любы з дзяцінства, сэрцу мілы край» (падвядзенне вынікаў праекта) | снежань 2020 года | педагогі, вучні, бацькі, члены грамадскіх аб’яднанняў |

**асноўная частка праекта**

Самым буйным мерапрыемствам, арганізаваным у межах праекта стане Марафон карысных ідэй і спраў « Тут Радзімы маёй пачатак »

Чалавека матывуе ўсведамленне, што яго праца важная і патрэбная для грамадства. Ініцыятыўным аўтарам неабходны “выхад у свет”, толькі так яны знойдуць прыхільнікаў і паслядоўнікаў, атрымаюць шанец на паспяховую і поўную рэалізацыю задум.У гэтым плане Марафон стане добрым падмуркам для ініцыятыў творчай і амбіцыйнай моладзі.

Асноўныя мэты і задачы Марафона:

- заахвочванне грамадзян, у першую чаргу моладзі, да рэалізацыі
канкрэтных спраў на карысць роднай краіны і яе жыхароў, прапаганда інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу;
- фарміраванне каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да
гісторыі і культуры свайго краю праз далучэнне да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны рэгіёна;
- фарміраванне грамадзянска-патрыятычных пачуццяў і
адказнасці за сваю будучыню;
- выхаванне ў падрастаючага пакалення пазітыўных маральна-
каштоўнасных якасцей і міласэрнасці;
- выяўленне і распаўсюджванне творчых ініцыятыў;
- далучэнне вучняў і педагогаў да адукацыйнай, культурнай і
грамадскай дзейнасці.

Удзельнікам будзе прапанавана тры вялікія тэмы для рэалізацыі ўласных ініцыятыў. Моладзь, чые інтарэсы ў першую чаргу звязаныя з краязнаўствам, захаваннем нацыянальна-гістарычных каштоўнасцей, папрацуюць па накірунку «Малой Радзіме – наша павага» і прымуць удзел у шэрагу грамадска-патрыятычных мерапрыемстваў: канцэртаў, флэш- мобаў і г.д.

Прадэманстраваць уласныя дасягненні школьнікі і дарослыя змогуць ў намінацыі «Малой Радзіме – наш поспех».Удзельнікі прадэманструюць асабісты і калектыўны ўдзел ў спартыўных спаборніцтвах, школьных алімпіядах і іншых справах.

Марафон дазволіць вывесці на шырокае абмеркаванне, падзяліцца вопытам і цікавымі задумамі ў плане рэалізацыі дабрачынных ідэй. Тэма «Малой Радзіме – нашы добрыя справы» аб’ядвае ў сабе шырокі спектр мерапрыемстваў: дабрачынныя, экалагічныя акцыі, марафоны, суботнікі;добраўпарадкаванне школьных тэрыторый, паркаў, сквераў, мемарыялаў, абеліскаў, помнікаў ваеннай славы, гістарычных месцаў і г.д., вырошчванне расады для ўпрыгожвання горада, пасадка дрэў, кветак;валанцёрскія дабрачынныя акцыі.

У межах праекта «Малой Радзіме прысвячаецца...» будзе рэалізаваны конкурс «Спадчына малой радзімы. Глыбоччына ў мініяцюры». Яго ўдзельнікамі змогуць стаць педагогі і навучэнцы, улюбёныя ў краязнаўства. Мэта конкурсу – фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, развіццё цікаўнасці да гісторыі Глыбоцкага краю, архітэктурных помнікаў раёна.

Для рэалізацыі задумы трэба вырашыць задачы:

- выхаванне павагі да гісторыі і культуры сваёй радзімы, далучэнне навучэнцаў да нацыянальных каштоўнасцяў;

- развіццё сярод удзельнікаў конкурсу цікаўнасці да краязнаўства, паглыбленне іх тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў пры выкананні краязнаўчых даследаванняў;

- стварэнне макетаў самых вядомых архітэктурных аб'ектаў Глыбоцкага раёна.

Вучні гарадскіх і сельскіх школ разам з настаўнікамі адшукаюць звесткі пра выбітныя архітэктурныя помнікі сваёй мясцовасці. Вынікам іх працы стане выстава макетаў, арганізаваная ДУДА «Цэнтрам дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна».

Работы прызёраў і ўдзельнікаў будуць захаваны ў выглядзе электроннага фотаальбому і стануць дадатковым наглядным матэрыялам на ўроках гісторыі і факультатыўных занятках.

Для некаторых – забава. Для іншых – спосаб самавызначэння. Менавіта такім стане для маладых глыбачан конкурс фотаздымкаў "У аб'ектыве – родны край".

Мэты і задачы конкурсу:

- актыўнае ўключэнне ва ўсебаковае вывучэнне гісторыі, культуры і прыпроды роднага краю сродкамі фотамастацтва;

- далучэнне педагогаў і навучэнцаў да адукацыйнай, культурнай і грамадскай дзейнасці;

- эстэтычнае выхаванне і фарміраванне мастацкага густу;

- выяўленне і заахвочванне таленавітых педагогаў і навучэнцаў, прадастаўленне дадатковых магчымасцяў для іх самарэалізацыі;

- папулярызацыя фотамастацтва сярод педагогаў і навучэнцаў.

З лютага па жнівень 2019 года ўдзельнікі конкурсу адшукаюць свае лепшыя кадры ў намінацыях: «Прыгажосць майго краю», «Глыбоччына азёрна» «Спадчына Глыбоччыны» , «Асобы і пакаленні» , «Традыцыі».

Восенню ў школах Глыбоччыны традыцыйна святкуюць Дзень ведаў. І сімвалічна, што конкурс літаратурных работ «Бацькаўшчына светлая мая»таксама адбудзецца у восень, калі ўсё наўкола нібыта запрашае спыніцца, паглядзець на гэта жыццё з пазіцыі вечнасці і паразважаць.

Мэты і задачы конкурсу:

- фарміраванне ў педагогаў і навучэнцаў грамадзянска- патрыятычных пачуццяў і адказнасці за захаванне духоўна- матэрыяльнай культуры сваёй малой радзімы праз далучэнне да літаратурнай дзейнасці;

- даследаванне звычаяў малой разімы, асаблівасцей побыту, традыцый і абрадаў;

- адраджэнне і перайманне сямейных традыцый, умацаванне сувязі пакаленняў праз далучэнне педагогаў і навучэнцаў да вывучэння гісторыі і этнаграфіі роднага краю.

Удзельнікі самі змогуць выбраць любы жанр для твора і распавядаць пра асаблівасці побыту сваёй вёсачкі, абрады і звычаі, што перадаваліся ў сем'ях пакаленнямі, пазнаёміць чытача з культурна- гістарычнымі помнікамі, знакамітымі землякамі, святамі і традыцыямі.

Конкурс-агляд сярод педагагічных калектываў устаноў адукацыі Глыбоцкага раёна «Адукацыя. Творчасць. Талент» аб'яднае у сабе тры пастулаты паспяховага і сучаснага настаўніка. Для многіх педагогаў творчасць не проста частка работы, але крыніца самарэалізацыі, спосаб асэнсоўваць і ўзаемадзейнічаць з навакольным светам.

Мэта конкурсу: развіваць мастацкую творчасць, выявіць і падтрымаць творчых, таленавітых педагогаў, педагагічныя калектывы.

Задачы:

- папулярызацыя мастацкай творчасці;

- павышэнне мастацкага ўзроўню, выканаўчага майстэрства і сцэнічнай культуры творчых калектываў;

- дапамога развіццю творчага патэнцыялу педагогаў і творчых калектываў устаноў адукацыі;

- пошук яркіх самабытных аўтараў і выканаўцаў, дапамога і падтрымка іх далейшай самарэалізацыі;

- захаванне і развіццё народных традыцый.

Агляд будзе арганізаваны такім чынам, каб ахапіць як мага больш накірункаў мастатва. Пяць асноўных намінацый ахопяць вялізны пласт творчай дейнасці: ад эстрадных і народных спеваў да спаборніцтва дэкламатараў, ад жывапісу да габелену і дэманстрацыі асаблівасцяў народных абрадаў.

У адукацыі значныя сілы аддадзены на выяўленне таленавітых дзяцей. Набыты цераз агляд-конкурс вопыт яскрава сведчыць: каб дзіця натхнялася на творчасць, у яго павінен быць акрылённы настаўнік. І для іх дваіх проста неабходны адкрыты шлях да самарэалізацыі, абмену вопытам, садружнасці і падтрымкі.

Праца з кампьютарам на ўзроўні распрацоўкі праграм патрабуе ад карыстальніка засяроджанасці… і творчага мыслення. Віртуальны свет адкрывае перад школьнікамі неверагодны прастор для рэалізацыі творчых задум. Цікаўнасць навучэнцаў да тэмы інфармацыйных тэхналогій дазволіць правесці конкурс на лепшы мультымедыйны фільм пра Глыбоцкі раён, выкананы ў праграме Scratch.

Мэты конкурсу: грамадзянска-патрыятычнае выхаванне навучэнцаў, развіццё інтарэса і матывацыі школьнікаў у вывучэнні сучасных тэхналогій, а таксама фарміраванне прафарыентацыйнай накіраванасці на выбар будучай прафесіі, звязанай з інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі.

Мэта будзе рэалізавана праз наступныя задачы:

- падтрымаць мясцовую культуру і захаваць гістарычную спадчыну рэгіёна;
- заахвоціць творчую актыўнасць навучэнцаў у сферы сучасных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій;
- папулярызаваць атрыманне ведаў па рабоце з праграмай Scratch.

Моладзь – лічы, самы актыўны спажывальнік і вытворца відэакантэнту. Паступова, але ў рэаліі беларускай культуры прыходзіць з'ява аўтарскага, непрафесійнага кіно, якое можна зняць на камеру звычайнага смартфона. Усё гэта павялічвае цікаўнасць у тым ліку і школьнікаў да жанру відэамастацтва. Калі раней фраза «сам сабе рэжысёр"выкарыстоўвалася, хутчэй, як жарт, то цяпер гэта частка маладой і перспектыўнай сучаснай культуры. Маладыя аўтары шукаюць новыя фарматы, новыя вобразы, новую стылістыку для кантакту з гледачом. На гэту сучасную плынь інтарэсаў разлічаны конкурс вдэаролікаў «Куточак Беларусі – маленькая радзіма». Яго арганізатарамі пастаўлены наступныя мэты і задачы:

- фарміраванне каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі і культуры свайго краю;
- фарміраванне грамадзянска-патрыятычных пачуццяў, адказнасці за адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны малой радзімы;
- папулярызацыя мясцовых помнікаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны;
- развіццё і папулярызацыя відэамастацтва сярод педагогаў і навучэнцаў.

Намінацыі для конкурсных відэаролікаў традыцыйнымі. У «Краявідах маленькай радзімы» аўтарам прапануецца адлюстраваць прыгажосць роднага краю, помнікі прыроды, жывёльны і раслінны свет, гістарычнае мінулае, культуру і архітэктуру Глыбоччыны. «Сваімі землякамі ганаруся» вымагае жанравай стылістыкі інтэрв'ю. Размова перад аб'ектывам відэакамеры з вядомымі людзьмі малой радзімы павінна раскрыць лёс і характар чалавека. Вялікае поле для эксперымантаў з жанрам і формай падачы матэрыялу адкрые перад удзельнікамі намінацыя «Гісторыя маёй школы».

Квіз – гэта сучасная віктарына ў выглядзе гульні. У ёй пытанні завязаны на дэманстрацыі відэакантэнту, а асноўны ўпор ідзе на жывыя

стасункі паміж удзельнікамі, святочную атмасферу і – канешне ж –фотафіксацыю этапаў гульні. У межах праекту «Малой радзіме прысвячаецца…» для настаўнікаў з Глыбоцкага раёна будзе праведзены «Педагагічны квіз». Яго мэты і задачы наступныя:

- развіццё новых форм адпачынку ў асяродку педагагічных калектываў;
- папулярызацыя культурна напоўненага, інтэлектуальнага адпачынку педагогаў.

**заключэнне**

Цягам двух гадоў праект «Малой радзіме прысвячаецца…» аб'ядноўваў людзей і дапамагаў ім больш глыбока паглядзець на гісторыю, культуру і побыт роднага краю. Падсумоўваючы вынікі, можна выдзеліць некалькі важных напрамкаў праведзенай працы.

- Скіраванасць праекту на розныя аспекты развіцця асобы. (Конкурсныя заданні вымагалі ад удзельнікаў творчага таленту, дэманстрацыі лідарскіх і арганізацыйных здольнасцяў, аналітычных навыкаў і крэатыўнага мыслення.)
- Стварэнне творчых тандэмаў, акцэнт на сумесную працу вучняў, настаўнікаў, бацькоў.
- Скіраванасць на практычныя даследаванні. (Самастойны пошук інфармацыі, яе далейшая творчая апрацоўка, выбар найлепшай формы падачы – усё гэта прыводзіць да больш глыбокага засваення і асэнсавання атрыманых звестак.)
- Публічнасць. (Удзел, ацэнка і дэманстрацыя вынікаў конкурсаў выведзены ў сферу шырокага грамадскага асвятлення. Кожны жыхар раёна мог далучыцца да абмеркавання цераз сацыяльныя сеткі.)
- Пошук новых, больш эфектыўных і сучасных формаў для падачы і засваення матэрыялу.

Супрацоўніцтва з грамадскімі аб'яднаннямі, якія могуць аказаць установам адукацыі больш комплексную і ўсебаковую падтрымку.

Як бачна, падобныя шырокафарматныя праекты дазваляюць выявіць найбольш эфектыўныя метады адукацыйнай і выхаваўчай работы з моладдзю, падштурхнуць педагогаў да новых форм работы з вучнямі, садзейнічаць пашырэнню кругагляда і гарманічнага развіцця маладой асобы.

Літаратура

1. Глыбоччына: ад старажытнасці да сучаснасці [Тэкст]: / рэдкал. Т.У.Бялова [і інш.].– Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі, 2009. – 735 с., іл.

2. Там дзе возера Глыбокае [Текст]: Глыбоччына літаратурная : проза, драматургія, публіцыстыка.- Мн.: Маст. літ., 2012. – 414 с.
3. Глыбоччына. Зямля любімая навечна, дзе Доўгае і Беразвечча… / аўт. тэксту У.І.Бацкалевіч ; фота К.Л.Дробава, А.П.Дробава, А.В.Адэдэжы, М.М.Бегунковай ; маст. В.Г. Паўлавец.– Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012 .– 168 с.
4. Сайт ДУК "Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"
5. Сайт Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея.










## Пошукава-даследчы праект
## «Хараство глыбоцкіх прыгажунь»

*Шпакава Аксана Андрэеўна,метадыст*
*Пачкоўская Ірына Ўладзіміраўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*



### Уводзіны

Будучыня цывілізаванага грамадства залежыць ад духоўнасці і маральнасці яго грамадзян. Адным з магчымых шляхоў духоўнага і маральнага выхавання падрастаючага пакалення з'яўляецца далучэнне яго да вывучэння сваёй малой радзімы, яе гісторыі, традыцый, культурнай спадчыны. Вывучаючы ўсё гэта, навучэнец пачынае адчуваць сябе яго часткай, адчувае гонар за сваю краіну. Для вырашэння гэтых пытанняў існуе мноства шляхоў. Захоўваючы і перадаючы наступным пакаленням культурныя і маральныя каштоўнасці нашага беларускага народа, трэба вяртаць у наша жыццё і жыццё нашых дзяцей самаробную народную ляльку. Вялікую каштоўнасць працы з народнай лялькай зразумець не цяжка. Лялька – першая цацка, таму яна блізкая і зразумелая дзіцяці. Рукатворная лялька – частка народнай традыцыі. Выробляючы яе, навучэнец пазнае гісторыю свайго народа. Лялька не нараджаецца сама, яе стварае чалавек, а самыя таленавітыя творцы лялек – дзеці. Праз лялечны свет яны ўваходзяць у жыццё і спасцігаюць яе заканамернасці. Лялька – бачны пасрэднік паміж светам дзяцінства і светам сталых. Яе галоўная каштоўнасць яшчэ і ў тым, што яна, з'яўляючыся часткай культуры, захоўвае ў сваёй выяве самабытнасць і характэрныя рысы таго народа, які стварае яе.  Падчас вырабу лялькі, дзеці вучацца чуць, бачыць, адчуваць, разумець і фантазіраваць. Апроч таго, фарміруюцца ўседлівасць, мэтанакіраванасць, здольнасць даводзіць пачатую справу да канца, развіваецца дробная маторыка рук. І яшчэ! Беларуская народная лялька мае сваю хвалебную гісторыю і багатыя традыцыі. Працуючы над гэтай гіпотэзай у праекце, паспрабуем у гэтым пераканацца.

Мэта праекта: фарміраванне ў навучэнцаў цікавасці да гісторыі і культуры беларускага народа праз выяву традыцыйнай народнай лялькі.

Задачы:
– пазнаёміць дзяцей з гісторыяй узнікнення народнай лялькі;
– раскрыць ролю народнай лялькі ў жыцці людзей;
– пазнаёміць з асаблівасцямі лялек беларускага народа;
– вывучыць асаблівасці беларускага касцюма;
– вывучыць асаблівасці касцюма глыбоцкага ладу;
– навучыцца на практыцы тэхналогіі вырабу розных выглядаў лялек;
– вырабіць ляльку ў народным касцюме глыбоцкага ладу.

Пры дасягненні мэты трэба прытрымліваецца наступных прынцыпаў:
– прынцып даступнасці вывучанага матэрыялу;
– прынцып гістарызма, які рэалізуецца шляхам захавання храналагічнага парадку апісваных з'яў;
– прынцып «Адзінства эмоцый, дзеяння, інтэлекту» - гэты прынцып мяркуе, што ўсе веды, якія навучэнцы атрымаюць, павінны быць прапушчаны ім праз сэрца, рукі і галаву. У гэтай трыядзе эмоцыі стаяць на першым месцы, бо ўсё, што прапушчана чалавекам праз душу, у ёй і застаецца. Часам штосьці забываецца, сціраюцца з памяці нейкія факты, падзеі, а вось пачуцці, выпрабаваныя ў дзяцінстве, застаюцца з чалавекам надоўга, часам на ўсё жыццё;
– прынцып інтэграцыйнасці – мае на ўвазе, што азнаямленне навучэнцаў з гісторыяй і культурай беларускага народа можа быць стрыжнем, вакол якога інтэгруюцца розныя выгляды дзіцячай дзейнасці, розныя галіны ведаў.

Этапы рэалізацыі праекта

1 этап падрыхтоўча-арганізацыйны:
– наладжванне сувязі з соцыумам, наведванне навучэнцамі музея, бібліятэкі, выстаў творчасці,гарацкого цэнтра культуры;
– падбор метадычнай літаратуры пра гісторыю лялькі;
– складанне плана работы ў праекце;
– афармленне схем паслядоўнасці вырабу лялек;
– падбор матэрыялаў для вырабу лялек.

***2*** этап – практычны: **-** рэалізацыя асноўных напрамкаў дзейнасці па рабоце праекта;
– азнаямленне дзяцей з гісторыяй і значэннем лялькі ў жыцці чалавека;
– выраб з дзецьмі гульнёвых, абрадавых і лялек-забярэгаў;
– выраб з навучэнцамі лялек у адзенні глыбоцкага строю.

***3*** этап заключны:- прэзентацыя навучэнцамі пошукава-даследчага праекта.

Асноўныя віды дзейнасці ў праекце:

- творчы;
- гульнёвы;
- пошукава-даследчы.

Тэрміны рэалізацыі: лістапад 2016г. – студзень 2017г.

Месца рэалізацыі: Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна».

Удзельнікі: педагогі дадатковай адукацыі, гурткоўцы аб’яднанння па інтарэсах ДУДА «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна», бацькі.

## Асноўная частка

Праект «Хараство глыбоцкіх прыгажунь» рэалізуецца сярод гурткоўцаў аб’яднанняў па інтарэсах: «Дэкаратыўны дызайн», «Папяровае мадэляванне», «Майстар і майстрыца», «Эцюд», тэатр моды «Аліса». Вынікам праекта стане выраб лялек у стылізаваным адзенні глыбоцкага строю. Праца ў праекце будзе цікавай для навучэнцаў, бо у іх ёсць магчымасць зрабіць свой маленькі ўнёсак у сучасную выяву народнага касцюма. Не гледзячы на тое, што два гады назад працаўнікамі гарадскога цэнтра культуры па кроплях быў адноўлены касцюм глыбоцкіх красунь, заўсёды ёсць не запоўненая ніша, якую можна скласці з маленькіх, але вельмі важных элементаў касцюма. І мы паспрабуем яе запоўніць сваёй пошукава-даследчай працай.

І так, з моманту аб'явы работы праекта навучэнцы ўключаюцца ў пошукава-даследніцкую дзейнасць па вывучэнні гісторыі свайго краю, гісторыі народнай цацкі – лялькі, гісторыі беларускага касцюма і касцюма глыбоцкага строю. З гэтай мэтай яны працуюць з архіўнымі матэрыяламі, дакументальнай і мастацкай літаратурай у раённай бібліятэцы, гутараць з супрацоўнікамі бібліятэкі. Апрача гэтага праводзіцца экскурсія ў раённы Дом рамёстваў, дзе становяцца ўдзельнікамі віктарыны «Мінулае роднага краю», знаёмяцца з працай народных майстроў-умельцаў, бяруць удзел у майстар-класах па авалоданні рознымі тэхнікамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і па вырабе простых лялек-забярэгаў. Таксама ў Доме рамёстваў праводзіцца экскурсія па міні-выставе майстроў-умельцаў Глыбоччыны. Навучэнцы бяруць удзел у круглым стале «Глыбоцкія традыцыі ўчора, сёння, заўтра». Такім чынам, знаёмячыся з гісторыяй свайго краю, яго традыцыямі і абрадамі, знакамітымі месцамі прывіваем у навучэнцаў любоў да Радзімы, жаданне ўсё больш карыснага і цікавага пазнаць пра яе «сакрэты».

Яшчэ адным крокам у знаёмстве з гісторыяй свайго краю і народным касцюмам глыбоцкага ладу стане экскурсія ў гарадскі цэнтр культуры.

Цікавай стане экскурсія таму, што два гады назад яго працаўнікі занялі 2 месца ў абласным конкурсе народных касцюмаў, адноўленых па выніках пошукавай працы.

Вялікая ўвага ў праекце надаецца працы з сям'ёй. Бо дзе, як не ў бабуль і дзядуль у сямейным альбоме захаваліся фотаздымкі даўніх часоў? Асабліва бабулі заўсёды трымаюць у памяці свае незабыўныя гады дзяцінства, а разам з імі свае першыя цацкі, сваі юнацкія часы, а з імі самые прыгожыя адзенні. Менавіта яны шмат чаго могуць паведаміць нам пра гісторыю касцюма.

Згодна працы ў праекце запланаваны паседжанні ў сямейным Клубе з тэмай «Бабуліны гісторыі», «Гульні і песні нашых бабуль» , «Мой дзядуля –майстар на ўсе рукі». Цікавым стане конкурс на самую лепшую гісторыю сярод матуль «Лялька майго дзяцінства – якая яна?».

Паводле праведзенай пошукава-даследчай працы адбудзецца міні-канферэнцыя для ўдзельнікаў праекта, якія падзеляцца сабранай інфармацыяй. Па выніках сабранага матэрыялу педагогамі разам з навучэнцамі ў творчай дзейнасці будзе выраблена дзве лялькі-глыбачанкі у народных касцюмах.

Закрыццё праекта «Хараство глыбоцкіх прыгажунь» будзе ўяўляць сабой прэзентацыю і вынік пошукава-даследчай і творчай дзейнасці. Добрым завяршэннем праекта стане выступленне тэатра моды «Аліса» з паказам калекцыі адзення, выкананай у народным стылі («З бабулінага куфэрка», «Рознакаляровая гульня»), калекцыямі звязанымі з гісторыяй Глыбоччыны («Жамчужыны Глыбоцкага краю», «Родныя вобразы» (па матывах творчасці Язэпа Драздовіча).

Такім чынам па завяршэнні праекта жадаем дабіцца наступных вынікаў:

-знаёмства навучэнцаў з гісторыяй беларусскай цацкі-лялькі;

-праз пашуковую дзейнасць знаёмства з гісторыяй беларускага касцюма, касцюма глыбоцкага строю;

-выраб лялек у касцюмах глыбоцкага строю;

-выхаванне любові да Радзімы, пачуцця патрыятызму і гонару за свой край;

-знаёмства з гісторыяй і знакамітымі землякамі роднага краю;

-захаванне нацыянальных традыцый;

-захаванне спадчыны і выкарыстанне яе ў выхаванні і фарміраванні асобы падрастаючага пакалення;

-знаёмства з новымі відамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

План работы ў праекце

| № п/п | Мерапрыемства | Дата |
|---|---|---|
| 1. | Адкрыццё праекта «Хараство глыбоцкіх прыгажунь» Знаёмства ўдзельнікаў праекта | лістапад |
| 2. | Наведванне школьных і раённай бібліятэк. Размовы з супрацоўнікамі бібліятэк | лістапад |
| 3. | Экскурсія у Дом рамёстваў. Віктарына «Мінулае роднага краю» | лістапад |
| 4. | Майстар-клас ад супрацоўнікаў Дома рамёсттваў «Цудоўныя лялькі» | лістапад |
| 5. | Экскурсія па міні-выставе майстроў-умельцаў Глыбоччыны. Круглы стол «Глыбоцкія традыцыі ўчора, сёння, заўтра» | лістапад |
| 6. | Экскурсія ў гарадскі цэнтр культуры. Знаёмства гурткоўцаў з адноўленым касцюмам глыбоцкага строю | снежань |
| 7. | Паседжанні ў сямейным клубе «Бабуліны гісторыі», «Гульні і песні нашых бабуль», «Мой дзядуля – майстар на ўсе рукі» | снежань |
| 8. | Конкурс на самую лепшую гісторыю сярод матуль «Лялька майго дзяцінства - якая яна?» | снежань |
| 9. | Пашукова-даследніцкая канферэнцыя «Беларуская народная лялька: гісторыя і сучаснасць» | снежань |
| 10. | Творчая работа па вырабу лялек | снежань |
| 11. | Творчая работа па вырабу лялек | студзень |
| 12. | Закрыццё праекта «Хараство глыбоцкіх прыгажунь». Выступленне тэатра моды «Аліса» з паказам калекцый адзення, выкананых у народным стылі («З бабулінага куфэрка», «Рознакаляровая гульня»); калекцый, звязаных з гісторыяй Глыбоччыны («Жамчужыны Глыбоцкага краю», «Родныя вобразы») | студзень |
| 13. | Прэзентацыя праекта ва ўстановах адукацыі г. Глыбокае | студзень |

Праект «Лялькі глыбоцкіх дзяўчат» ажыццяўляўся ў аб'яднаннях па інтарэсах «Дэкаратыўны дызайн», «Майстар і майстрыха», «Папяровае мадэляванне», «Эцюд», тэатр моды «Аліса» у творчым тандэме навучэнцаў, педагогаў і бацькоў. Праект рэалізоўваўся па састаўленаму плану.

Удзел у такім праекце стаў важным для навучэнцаў у плане выхавання на нацыянальных традыцыях, знаёмства з беларускім нацыянальным касцюмам, касцюмам глыбоцкага строю. Вялікую колькасць часу работы у праекце надзялялася знаёмству з беларускай народнай цацкай, больш за усё – лялькай. Працуючы з архіўнымі матэрыяламі, кожны ўдзельнік праекта знайшоў для сябе шмат новага і карыснага пра гісторыю сваёй краіны і сваёй малой Радзімы. Вельмі пазнавальнымі сталі экскурсіі у Дом рамёстваў, гарадскі цэнтр культуры ў горадзе Глыбокае. Добры вопыт атрымалі гурткоўцы ў пошукова-даследчай, а таксама ў праектнай дзейнасці. Атрыманы вопыт кожнаму з іх спатрабіцца ў далейшай вучэбнай дзейнасці.

Вельмі цікавай стаў творчы бок працы, бо ў ёй трэба было аб'яднаць увесь сабраны матэрыял, выбраць неабходны, важнейшы, адаптаваць да сябе і потым увасобіць у выкананні лялек у адзенні глыбоцкага строю.

Вялікую цікавасць да дадзенага праекта праявілі бацькі. Стаўшы удзельнікамі праекту, кожны з іх, нібыта вяртаўся у сваё дзяцінства. На сямейных сустрэчах мы пачулі шмат цікавых гісторый пра любімыя цацкі і лялькі. Цёплай і ўтульнай была забаўляльная праграма «Песні нашых бабуль і дзядуль». Калі дзеці бачаць пераемнасць пакаленняў у вывучанні гісторыі свайго краю, гэта адыгрывае вялікую ролю не толькі у сямейным выхаванні, але і патрыятычным, маральным, духоўным…

Супрацоўнічаючы ў рэалізацыі праекта з Глыбоцкай раённай бібліятэкай, Глыбоцкім Домам рамёстваў, Гарадскім цэнтрам культуры, установамі адукацыі г. Глыбокае, Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеям, навучэнцы атрымалі добры прыклад таму, як трэба любіць і шанаваць сваю гісторыю, традыцыі. Кожны з дзяцей бачыў з якім натхненнем, любоўю дарослыя распавядалі пра музейныя экспанаты, пра культуру, побыт, пра гісторыю беларускай кухні, касцюма і інш. А дарослыя, у сваю чаргу, бачылі гэтую недпаддзельную цікавасць дзяцей у пошукова-даследчай дзейнасці.

Вельмі цікавым быў творчы праект яшчэ і тым, што яго ўдзельнікі павінны былі ўвасобіць усе тыя маленькія дэталі касцюма глыбоцкага строю, якія яшчэ нідзе не дэманстраваліся, тое, што знайшлі самі. Гэтай вынаходкай для дзяцей стаў касцюм, размалёваны па матывах творчасці Язэпа Драздовіча. Язэп Драздовіч лічыцца знакамітым земляком глыбачан. Ён у

свой час вандраваў ад вёскі да вёскі і маляваў свае так званыя «маляванкі»-дываны. Мала хто ведаў, што прыгажуні яго часоў таксама ўпрыгожвалі сваё адзенне «маляванкамі».

Такім чынам, працуючы ў праекце можна адказаць, што сёння вывучаць гісторыю сваёй краіны, сваёй малой Радзімы цікава і неабходна для падрастаючага пакалення.

Літаратура

***1.*** Алексахин, Н.Н., Алексахина Т.И. Изготовление игрушек по мотивам народных образцов. /Н.Н.Алексахин,Т.И.Алексахин/Начальная школа–1991.-№ 9.–с.49-52.

***2.*** Глубокский историко-этнографический музей [Электронный ресурс] Режим доступа: http://glubmusej.by/ru/home. – Дата доступа: 01.10.2016.

***3.*** Глыбоччына: ад старажытнасці да сучаснасці / рэдкал. : Т.У. Бялова [і інш.]. – Мінск: Беларус.Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. с. іл.

***4.*** Глыбоччына. Зямля любімая навечна, дзе Доўгае і Беразвечча… / аўт. тэксту У.І. Бацкалевіч; фота К.Л. Дробава, А.П. Дрыбаса, А.В. Адэдэджы, М.М. Бегунковай; маст. В.Г. Паўлавец. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012. – 168 с. іл.

***5.*** Дучиц, Л. Как одевались наши предки // Деды: дайджест публикаций о беларуской истории. /Л.Дучиц/Выпуск 13. Минск, 2014. С. 213-233.

***6.*** Зимина, З.И. Текстильные обрядовые куклы. /З.И.Зимина/ Методическое пособие. - Мн.:2006.

***7.*** Касцюкевіч ,С.У. Беларуская народная цацка як сацыякультурны феномен і каштоўнасць // Материалы международной научно-практической конференции “Преподобная славянских народов”, посвященная 100-летию перенесения святых мощей преподобной Ефросиньи Полоцкой из Киева в Полоцк. – Полоцк, 2010. - С. 138

***8.*** Касцюкевіч С.У. Цацкі-прылады для гульні ў беларусаў // Веснік ПГУ. № 4. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2005.

***9.*** Лозка ,А.,Беларуская цацка і гульня: Матэрыялы ў дапам. ствральнікам цацак і гульняў на аснове бел. нар. мастацтва, этнагр. і фальклору./А.Лозка А.Лявонава/ Мн., 1996.

***10.*** Народная культура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. - Мн.: “Беларуская энцыклапедыя”, 2002

***11.*** Церашковіч ,Т. Лялька беларуская. /Т.Церашковіч /Мн., 1992. 126с.: іл.

12. Хайноўская, А. Магія Глыбоцкіх ручнікоў / А. Хайноўская // «Веснік Глыбоччыны». – 2017. – 4 студзеня – с. 8










## Пошукава-даследчы праект
## «Вязальнага кручка дзівосы»

*Шпакава Аксана Андрэеўна,метадыст*
*Пачкоўская Ірына Ўладзіміраўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*

### Уводзіны



20 чэрвеня 2018 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў

Указ № 247 аб правядзенні ў Беларусі 2018-2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы ў мэтах стымулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў насельніцтва, захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Вялікая ўвага гэтай падзеі надаецца ва ўстановах адукацыі, дзе на першы план выходзіць выхаванне такіх якасцей асобы навучэнцаў, як грамадзянскасць, патрыятызм, духоўнасць і маральнасць. Ад таго, на колькі будуць развітыя гэтыя якасці ў навучэнцаў сёння залежыць будучыня Рэспублікі Беларусь. Існуе велізарная колькасць шляхоў па выхаванню такіх якасцей асобы ў падрастаючага пакалення, адным з якіх з'яўляецца выкарыстанне магчымасцей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адлюстроўваюць мастацкія традыцыі нацыі, светаразуменне, светаўспрыманне і мастацкі вопыт народа, захоўваюць яго гістарычную памяць. Каштоўнасць твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і ў тым, што яны ўяўляюць прыродны свет, матэрыяльную культуру, а таксама з'яўляюцца помнікамі культуры духоўнай. Духоўная значнасць прадметаў народнага мастацтва асабліва ўзрастае ў наш час, таму што яны створаны талентам і душой нашых продкаў, якія любілі прыгажосць, тварыць яе. Прадметы народнага мастацтва ўносяць у наша жыццё святочнасць. Яны ўсе больш ўваходзяць у наш побыт не як ўтылітарныя прадметы, а як мастацкія творы, якія адказваюць нашым эстэтычным ідэалам, захоўваюць гістарычную сувязь часоў. Народнае мастацтва злучае мінулае з сучаснасцю, зберагаючы нацыянальныя мастацкія традыцыі. Падкрэсліваючы важнасць звароту навучэнцаў да традыцый, С. І. Гесэн, кажа: «Засвоіць спадчыну бацькоў, захаваць яе ад забыцця і разбурэння можна не пасіўна успрымаючы яго, а актыўна працягваючы працу продкаў,вырашаючы ўсё глыбей і глыбей пастаўленыя імі задачы... Толькі творчая праца над тымі ж заданнямі, якія прадстаялі і нашым продкам, ажыццяўляе цуд захавання мінулага, адлюстроўваючы ў мастацка-эстэтычным выхаванні ўсе тры вектара прасторы і часу – мінулага, сучаснасці, будучыні».

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва адносіцца ды спрадвечных каштоўнасцяў традыцыйнай беларускай культуры, якое стваралася і праяўлялася ў самых разнастайных відах і формах творчай дзейнасці. Вельмі цікавым, прыгожым відам творчай дзейнасці з'яўляецца мастацтва вязання кручком. Вязанне кручком – цудоўнае, старажытнае, але не страціўшае актуальнасці ў наш час, рукадзелле.

Яно з'яўляецца сапраўды масавым мастацтвам, якое сабрала па крупінах вопыт мастацкай творчасці ўсіх часоў і народаў. Займаючыся

вязаннем, спасцігаючы ўласцівасці рэчаў, вучні міжволі самі фарміруюць сябе і вобраз навакольнага свету, далучаюцца да рамяства, якое спатрэбіцца ім у жыцці.Мастацкае вязанне з'яўляецца спрадвечным народным рамяством,якое дазваляе дзецям пазнаёміцца з гісторыяй і культурай беларускага народа.Абапіраючыся на вышейсказанае мы распрацавалі праект «Вязальнага кручка дзівосы».

Гіпотэза праекта: вязанне кручком - від дэкаратыўна-прыкладной творчасці, які дазваляе далучыць навучэнцаў да вывучэння нацыянальнай культуры і традыцый беларускага народа.

Мэта праекта: фарміраванне ў навучэнцаў цікавасці да гісторыі і традыцый, культуры беларускага народа праз азнаямленне з мастацтвам вязання кручком.

Для раскрыцця мэты праекта стануць актуальнымі наступныя задачы:

- вывучыць тэарэтычныя крыніцы ўзнікнення мастацтва вязання кручком;
- пазнаеміць дзяцей з мастацтвам вязання кручком як відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- вывучыць асаблівасці выкарыстання мастацтва вязання кручком ў Беларусі і іншых краінах свету;
- -выклікаць ў вучняў цікавасць да гэтага віду творчасці;
- навучыць прымяняць данны від мастацтва на практыцы;
- фарміраваць здольнасць развіваць набытак роднай культуры з выкарыстаннем сродкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- далучаць вучняў да дасягненняў роднай культуры праз практычнае вывучэнне традыцыйных рамёстваў і розных відаў дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва;
- ствараць умовы для самарэалізацыі і прафесійнага самавызначэння кожнага навучэнца;
- развіццё навыкаў самастойнай даследчай работы ў навучэнцаў;
- абагульненне і сістэматызацыя ведаў, атрыманых падчас праектнай дзейнасці.

Пры дасягненні мэты неабходна прытрымлівацца наступных прынцыпаў:

- прынцып апераджальнага навучання (ўзбагачэнне навучальнага матэрыялу дадатковымі дадзенымі, заданнямі творчага характару);
- прынцып разнастайнасці меркаваных магчымасцяў для рэалізацыі здольнасцей навучэнцаў;
- прынцып развіваючага навучання;

- прынцып сувязі вучэбнага матэрыялу з жыццевым вопытам вучняў, у іх актыўнай пазнавальнай і творчай сумеснай дзейнасці;
- прынцып ад простага да складанага;
- прынцып нагляднасці ;
- прынцып дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі, які прадугледжвае стварэнне умоў для развіцця кожнага навучэнца;
- прынцып даступнасці ;
- прынцып сістэмнасці; прынцып гістарызму, які рэалізуецца шляхам захавання храналагічнага парадку апісання дзеянняў;
- прынцып камфортнасці ў творчай дзейнасці;
- прынцып адзінства эмоцый, дзеяння, интэлекту ( прынцып мяркуе, што усе веды, якія атрымліваюць навучэнцы павінны быць прапушчаны праз «сэрца, рукі і галаву», дзе эмоцыі стаяць на першым плане,бо тое, што прапушчана праз душу, ў ёй і застаецца.Часам штосьці забываецца, сціраюцца з памяці нейкія факты, падзеі. А вось пачуцці, атрыманыя ў дзяцінстве, застаюцца з чалавекам надоўга, амаль што на усё жыццё);
- прынцып интэграцыйнасці – мае на ўвазе, што азнаямленне навучэнцаў з гісторыяй і культурай беларускага народа можа быць стрыжнем, вакол якога інтэгруюцца розныя віды дзіцячай дзейнасці, розныя галіны ведаў.
- рэгіянальны прынцып.

Этапы рэалізацыі праекта:

1этап падрыхтоўча-арганізацыйны:

- наладжванне сувязі з соцыумам, наведванне навучэнцамі музеяў, бібліятэкі, выстаў творчасці, дома раместваў, гарадскога цэнтра культуры;
- падбор метадычнай літаратуры па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- складанне плана работы ў праекце;
- планаванне работы па вырабу ўзораў работы ў тэхніцы вязання кручком;
- пошук схем вязання кручком;
- падрыхтоўка неабходнага матэрыялу для выканання вырабаў завяршальнай працы па праекце.

2этап - практычны - рэалізацыя асноўных напрамкаў дзейнасці па рабоце праекта;

- знаёмства дзяцей з гісторыяй узнікнення тэхнікі вязання кручком;
- аваloданне асноўнымі спосабамі вязання кручком;
- выраб кружаў для упрыгожвання дамашніх рэчаў;

- афармленне кампазіцыі «Беларуская хатка», аздобленай вырабами з кружаў.
- 3 этап – заключны:
- прэзентацыя навучэнцамі пошукова-даследчага праекта сярод навучэнцаў;
- прэзентацыя пошукова-даследчага праекта ў раённай бібліятэцы;
- удзел у абласным этапе рэспубліканскага конкурсу.

Асноўныя віды дзейнасці ў праекце:
- пошукова-даследчы;
- гульневы;
- творчы;
- працоўны.

Тэрміны рэалізацыі праекта:
- Кастрычнік 2018г. - май 2019г.

Месца рэалізацыі праекта:
- Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раена».

Удзельнікі:
- педагогі дадатковай адукацыі,
- гурткоўцы аб'яднанннаяў па інтарэсах ДУДА «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раена»,
- бацькі.

## Асноўная частка праекта

Пошукова-даследчы праект «Вязальнага кручка дзівосы» рэалізуецца ва ўстанове дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна» сярод гурткоўцаў аб'яднанняў па інтарэсах «Дэкаратыўны дызайн», узорны тэатр моды «Аліса» ў сатворчасці з іх кіраўнікамі, бацькамі.

Дадзеная тэма праекта для яго ўдзельнікаў з’яўляецца не звычайнай і цікавай па-першае таму, што да цяперашняга часу не кожны ведаў, што гісторыя вязання кручком мае багатую гісторыю і мае шмат цікавых версій яго паходжання. Па-іншае, тое, што вязанне кручком на Беларусі выкарыстоўваецца з далекіх часоў не толькі як для вырабу адзення, але і для упрыгожвання хатніх прадметаў побыту. Па-трэццяе, удзельнікі праекта пад кіраўніцтвам настаўнікаў авалодаюць і ўдасканаляць навыкі вязання кручком, пазнаёмяцца з новымі спосабамі вязання і прымянення выкананых работ. Працуючы ў такім праекце ў гурткоўцаў і кіраўнікоў паявіцца магчымасць даведацца самім пра тое, як на Глыбоччыне прымянялі гэты від рукадзелля, а таксама падзяліцца вопытам на раенных і гарадскіх канферэнцыях, прысвечаных Году Малой радзімы.

Па задумцы удзельнікаў праекта «Вязальнага кручка дзівосы» вынікам пошукова-даследчай працы стане выраб макету беларускай хаткі з аздабленнем яго побыту вырабамі з рэчаў, вязаных кручком і з рысамі беларускага каларыту.

З чаго пачнецца праца над праектам? Першапачаткова для ўдзельнікаў праекта праводзіцца гульнёвы трэнінг-знаёмства «Шлях да поспеху» на згуртаванне калектыву і далейшай плённай працы.

Наступным крокам у праекце з'яўляецца пошукава-даследчая праца, у якой навучэнцы разам з кіраунікамі вывучаюць гісторыю свайго краю, побыт беларускага народа, жыхароў Глыбоччыны, паглыблена знаемяцца з відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, больш глыбей з мастацтвам вязання. Таксама цікавяцца якімі відамі дэкаратыунай творчасці займаліся беларусы.

Найбольш увагі пры пошукова-даследчай працы надаецца абранай тэме праекта-гісторыі вязання кручком, у тым ліку карункаў і іх прымяненне для ўпрыгожвання побыту. З гэтай мэтай навучэнцы працуюць з архіўнымі матэрыяламі, дакументальнай і мастацкай літаратурай у школьнай і раённай бібліятэках, карыстаюцца інтэрнэт-рэсурсамі, праводзяць гутаркі з супрацоўнікамі бібліятэкі, майстрамі Дома рамёстваў, Цэнтра дзяцей і моладзі, меснымі жыхарамі, якія з’яўляюцца майстрамі дадзенага віда рукодзелля. Пазнавальнай стане для ўдзельнікаў экскурсія ў этнаграфічныя музеі Падсвільскай і Празарокскай школ Глыбоцкага раёна, у якіх маюцца экспанаты, аздобленыя вязанымі карункамі, выраблены меснымі майстрыхамі.

Ціквую гульню-вандроўку «Вандраванне па рамёствах» распрацавалі і прапанавалі супрацаўнікі раённай бібліятэкі. Яны таксама зрабілі падборку дакументальнай і мастацкай літаратуры ўдзельнікам праекта па знаемству з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, у тым ліку і мастацтвам вязання кручком.

Працуючы ў праекце, навучэнцы становяцца ўдзельнікамі майстар-класа «Вяжам бабулін палавік», які правяла педагог дадатковай адукацыі Пачкоўская Ірына Уладзіміраўна. Яна ж прадставіла для ўсіх персанальную выставу сваіх вырабаў, вязаных кручком, якая мае назву «Цудоўныя рэчы сваімі рукамі».

У межах праекта прадугледжана работа з сям’ёй. У гэтым напрамку работы ўдзельнікі праекта папрысутнічаюць і на міні-выставе творчасці ў ДУА «СШ №3г. Глыбокае». Не менш цікавай стала выстава «Фантазіі кручком», вязаных рэчаў, палавікоў, на якую прадставілі свае творчыя работы матулі, бабулі навучэнцаў. Нікому не сакрэт, што ў кожнай хаце знойдзецца хоць адна вязаная залатымі рукамі бабулі ці матулі рэч. А гэтыя рэчы нясуць

вялікую каштоўнасць, таму што маюць непаўторны малюнак, часцей за ўсё прыдуманы «з галавы». І калі бабулі дзеляцца сваёй творчасцю з падрастаючым пакаленнем, вучаць самастойна выбіраць ўзоры, такім чынам развіваюць фантазію і жаданне дабівацца прыемнага выніка. Кожны дарослы разумее - лепшы настаўнік у навучанні творчасцю - нашы матулі і бабулі. На творчыя сустрэчы ў сямейны клуб мы запрасілі матуль і бабуль. Адбылося дзве сустрэчы - «Бабуліны сакрэты» і «Я і бабуля-майстрыха на ўсе справы». На паседжанні бабулі расказвалі, чым займаліся ў маладосці сямейнымі вечарамі, якія спявалі песні падчас выканання работ.

Адным з напрамкаў дзейнасці ў праекце з'яўляецца паказ калекцый адзення, выраблення выхаваўцамі ўзорнага тэатра моды «Аліса» вязаныя кручком. (Калекцыя «Рознакаляровая гульня» і «З бабулінага куфэрка»)

Паспрабаваць свае творчыя магчымасці змаглі навучэнцы з кіраўнікамі Цэнтра дзяцей і моладзі, працуючы ў «Творчай майстэрні» праекта па сучасным напрамку вязання кручком - ярнбомбінг. У гэтым стылі «апранулі» дрэва каля Цэнтра дзяцей і моладзі. Працуючы над гэтай работай яшчэ ўдасканаліліся, што майстэрства вязання кручком актуальна ва ўсе часы, у тым ліку і на цяперашнім этапе не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Вялікая ўвага ў праекце надаецца напрамку працоўнай дзейнасці, які ўключае ў сябе практычную частку праекта. Падчас яе навучэнцы авалодваюць прыёмамі і спосабамі вязання, вучацца разбіраць і састаўляць схемы, выконваюць творчыя заданні настаўніка. На аснове атрыманых ведаў вяжуць карункі, якімі аздабляюць ручнікі, пасцельныя прыналежнасці. Па выніках працы навучэнцы разам з кіраўнікамі арганізуюць міні-выставу сваіх работ праз выраб «беларускай хаткі».

Напрыканцы праекта навучэнцы і кіраўнікі афармляюць яго і праводзяць круглы стол «Вязальнага кручка дзівосы» сярод навучэнцаў і педагогаў дадатковай адукацыі Цэнтра дзяцей і моладзі.

Такім чынам, па завяршэнні праекта мы жадаем дабіцца наступных вынікаў:

- вывучыць тэарэтычныя крыніцы па пытанні ўзнікнення мастацтва вязання кручком;
- пазнаёміцца з мастацтвам вязання кручком як відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- вывучыць асаблівасці выкарыстання мастацтва вязання кручком ў Беларусі і іншых краінах;
- выклікаць ў вучняў цікавасць мастацтва мязання кручком як віду творчасці;
- навучыць прымяняць данны від мастацтва на практыцы;

- зрабіць ўзоры вырабаў для ўпрыгожвання дома з выкарыстаннем тэхнікі вязання кручком;

- фарміраваць здольнасць развіваць набытак роднай культуры з выкарыстаннем сродкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

- далучаць вучняў да дасягненняў роднай культуры праз практычнае вывучэнне традыцыйных рамёстваў і розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

- развіваць навыкі самастойнай даследчай работы ў вучняў, абагульнення і сістэматызацыі ведаў, атрыманых у ходзе праектнай дзейнасці.

План работы ў праекце

| № п/п | Мерапрыемства | Дата |
|---|---|---|
| 1. | Адкрыццё праекта «Вязальнага кручка дзівосы». Гульнёвы трэнінг-знаёмства «Шлях да поспеху». | лістапад |
| 2. | Работа з мастацкай і дакументальнай літаратурай, інтэрнэт-рэсурсамі. | на працягу работы праекта |
| 3. | Наведванне школьных і раённай бібліятэк. Размовы з супрацоўнікамі бібліятэк. | лістапад |
| 4. | Гульня-вандраванне «Вандраванне па рамёствах». | снежань |
| 5. | Экскурсія ў этнаграфічны музей УА «Падсвільская ДС-СШ Глыбоцкага раёна». | снежань |
| 6. | Экскурсія ў этнаграфічны музей УА «Празарокская ДС-СШ Глыбоцкага раёна». | студзень |
| 7. | Майстар-клас «Вяжам бабулін палавік» | студзень |
| 8. | Персанальная выстава І.У.Пачкоўскай «Цудоўныя рэчы сваімі рукамі». | студзень |
| 9. | Наведванне міні-выставы творчасці «Вязанне кручком» у ДУА «СШ №3г». | Люты |
| 10. | Выстава бабуліных вырабаў «Фантазіі кручком» у ДУДА «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна» | Люты |
| 11. | Сустрэча ў сямейным клубе «Бабуліны сакрэты» | студзень |

| | | |
|---|---|---|
| 12. | Сустрэча ў сямейным клубе «Я і бабуля-майстрыхі на ўсе справы». | лістапад |
| 13. | Творчая майстэрня па вырабу «адзення для дрэва» у стылі «ярнбомбінг». | сакавік |
| 14. | Творчая работа па праекту | Люты-сакавік |
| 15. | Міні-выстава «Рознакаляровыя ўзоры» | сакавік |
| 16. | Круглы стол па выніках работы праекта «Вязальнага кручка дзівосы». | сакавік |
| 17. | Прэзентацыя вопыту работы ў праекце ў раённай бібліятэцы. | сакавік |

Праект «Вязальнага кручка дзівосы» ажыццяўляўся ў аб’яднаннях па інтарэсах «Дэкаратыўны дызайн», узорным тэатры моды «Аліса» ў творчым тандэме навучэнцаў, педагогаў і бацькоў. Праект рэалізоўваўся на аснове састаўленага плана.

Падчас адкрыцця праекта важную ролю адыграў гульнёвы трэнінг-знаёмства «Шлях да поспеху», пры дапамозе якога ўсе ўдзельнікі праекта пазнаёміліся і сплаціліся ў творчы тандэм.

Працуючы з мастацкай і дакументальнай літаратурай навучэнцы разам з кіраўнікамі зрабілі вялікую пошуковую работу. На пачатку працы з літаратурай пазнаёміліся больш глыбей з паняццем «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» і яго роляй на сучасным этапе. Такім чынам дазналіся, што дэкаратыўна-прыкладное мастацтва адносіцца да спрадвечных каштоўнасцяў традыцыйнай беларускай культуры і з даўніх часоў займала асаблівае месца ў жыццядзейнасці і духоўнай сферы людзей. Неабходныя ў жыцці прадметы рабіліся не толькі зручнымі і прыгожымі, але ў іх укладваўся алегарычны, рэлігійна-містычны і абрадавы змест. Вырабы ганчарства і керамікі, ткацтва і вышыўкі, апрацоўкі дрэва і шкла, кавальскай справы, пляцення з прыродных матэрыялаў, вязанне, выцінанкі і іншыя, неаддзельныя ад побыту людзей, выконвалі не толькі ўтылітарна-функцыянальную ролю, але і з'яўляліся прадметамі эстэтычнай арганізацыі асяроддзя. Яны нясуць у сабе адбітак шматвяковай гісторыі краіны, у якім адлюстраваны жыццёвы аблічча і духоўны вопыт народа, а таксама ўзбагачаная тонкім густам і майстэрствам выканання эстэтычны ідэал. Разнастайныя вырабы, створаныя па законах мастацтва, не толькі ўпрыгожваюць вясковы побыт, але і нясуць у сабе сімвалічны код жыццёвага шляху чалавека з першых і да апошніх дзён яго жыцця.

Працуючы ў праекце «Вязальнага кручка дзівосы» падчас пошуковай работы шмат увагі надзялялася знаёмству з такім відам дэкаратыўна-прыкладной творчасці, як вязанне кручком. Цікавасць да гэтага віда творчасці абумоўлена тым, што звестак пра яго зусім мала. А нам хацелася адшукаць яго як мага болей цікавага матэрыялу, глыбей і больш пазнаёміцца з мастацтвам вязання кручком. Такім чынам мы знайшлі шмат цікавых гісторый, звязаных з мастацтвам вязання кручком. Цікавай стала інфармацыя з розных крыніц аб паходжанні гэтага віда рукаделля, дзе і калі былі знойдзены першыя ўзоры, калі сталі займацца гэтым рамяством у Беларусі і на Віцебшчыне, на Глыбоччыне. Падчас пошукова-даследчай работы шырэй пазнаёміліся дзе і для чаго прымяняліся вязаныя карункі і спосабы іх выканання. Гэтаму садзейнічалі экскурсіі ў Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей, музеі ДУА «Падсвільская СШ» і ДУА «Празарокская ДС-СШ». Наведванне музеяў таксама стала добрым прыкладам для ўдзельнікаў праекта з якім клопатам і пяшчотай адносяцца да кожнага экспаната супрацоўнікі музеяў, як зберагаюць той скарб, што застаўся ад продкаў. І вядома ж, такім чынам выхоўваем у навучэнцаў любоў да роднага краю, да людзей, якія жылі на гэтай зямлі і сваімі рукамі выраблялі сапраўдныя шэдэўры творчасці.

Вельмі пазнавальнымі сталі экскурсіі ў Дом рамёстваў, гарадскі цэнтр культуры ў горадзе Глыбокае. Пазнавальнай стала гульня-віктарына «Вандраванне па рамёстах», якую падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі. Супрацоўнічаючы ў рэалізацыі праекта з Глыбоцкай раённай бібліятэкай, Глыбоцкім домам рамёстваў, Гарадскім цэнтрам культуры, установамі адукацыі г. Глыбокае, Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеям, навучэнцы атрымалі добры прыклад таму, як трэба любіць і шанаваць сваю гісторыю, традыцыі. Кожны з дзяцей бачыў з якім натхненнем, любоўю дарослыя распавядалі пра музейныя экспанаты, пра культуру, побыт, пра гісторыю беларускай кухні, касцюма і інш. А дарослыя, у сваю чаргу, бачылі гэтую недпаддзельную цікавасць дзяцей у пошукова-даследчай дзейнасці.

Вялікую цікавасць да дадзенага праекта праявілі бацькі, дакладней кажучы матулі і бабулі. Стаўшы ўдзельнікамі праекту, кожны з іх, нібыта вяртаўся ў сваё дзяцінства. На сямейных сустрэчах мы пачулі шмат цікавых гісторый пра тое, як у далёкія часы, сабраўшыся у адной з хат дзяўчаты вышывалі, вязалі, пры гэтым спявалі, размаўлялі, гулялі ў гульні. Калі дзеці бачаць пераемнасць пакаленняў у вывучанні гісторыі свайго краю, яго традыцый, гэта адыгрывае вялікую ролю не толькі у сямейным выхаванні, але і патрыятычным, маральным, духоўным.

Вельмі падабалася ўдзельнікам праекта персанальная выстава аднаго з кіраўнікоў праекта Пачкоўскай Ірыны Уладзіміраўны, якая прадставіла на выставу свае вырабы, вязаныя кручком. Яна ж правяла майстар-клас па вязанню кручком «бабуліных палавікоў». На першы погляд вельмі трудаёмкая работа вельмі спадабалася навучэнцам.

Сваю творчасць праадаманстравалі і выхаванцы ўзорнага тэатра моды «Аліса» праз паказ калекцый «З бабулінага куфэрка» і «Рознакаляровая гульня».

Цікавай стараной праекта стаў творчы, працоўны бок працы, бо ў ёй трэба было аб’яднаць увесь сабраны матэрыял, выбраць неабходны, важнейшы, адаптаваць да сябе і потым увасобіць у выкананні творчай работы-вязанне кружаў для ўпрыгожвання. Па выніках пашукова-даследчай, творчай, працоўнай дзейнасці зрабілі міні-макет беларускай хаткі з упрыгожваннем яе прадметамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці, аздобленыя вязаннем.

Па завяршэнні праекта быў праведзены круглы стол ва ўстанове дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна», на якім прысутнічалі ўдзельнікі праекта, а таксама педагогі дадатковай адукацыі. У межах круглага стала адбылася прэзентацыя работы праекта.

Такім чынам, працуючы у праекце, яго удзельнікі глыбей пазнаёміліся з паняццем дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, а таксама з мастацтвам вязання кручком і яго тэарэтычнымі крыніцамі ўзнікнення. Работа ў праекце адыграла важную ролю ў далучэнні навучэнцаў да дасягненняў роднай культуры праз практычнае вывучэнне традыцыйных рамёстваў і розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Таксама трэба адзначыць, што выбраная форма работы-праектная дзейнасць-дапамагае развіваць навыкі самастойнай даследчай работы навучэнцаў - удзельнікаў праекта, абагульнення і сістэматызацыі ведаў, атрыманых у ходзе праектнай дзейнасці і атрыманне запланаванага выніка.

## Літаратура

1.Сахута,Я.М., Беларусы. Т.8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я. М. Сахута; рэдкал.: А.І. Лакотка. .[і інш]; Нац. Акад. Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Бел. Навука.

2. Высоцкая ,Н. Ф. Декоративно-прикладное искусство Белоруссии XII – XVIII веков. /Н.Ф.Высоцая /Минск: - изд. «Беларусь», 1984.

3.Жук, В.И. Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII-XXвв.: становление и тенденции развития/ В.И. Жук. – Минск: Бел. наука, 2006г.

4.Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мн.: БелЭн.

5. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў- беларускі ручнік: альбом / В.А.Лабачэўская.- Мінск: Беларусь.

6.Рондели, Л.Д. Народно декоративно-прикладное искусство. /Л.Д.Рондели.-Издательство Просвещение. М., 1984.

7.Уткин П.И., Королева Н.С. Народные художественные промыслы./П.И.Уткин.- Высшая школа. М., 1992.

8.Хворостов, А.С. Декоративно-прикладное искусство в школе./ А.С.Хворостов .- Издательство Просвещение. М., 2003.

9.Русецкий, А.В., Художественная культура Витебщины: Поозерье,Подвинье,Верхнее Поднепровье./ А.В.Русецкий,Ю.А.Русецкий .-Издательство УО «ВГУ им.П.М.Машерова»,2008.

10.У.І.Адамушка,У.И. Геральдычны вянок Віцебшчына./ У.И.Адамушка,М.М.Елінская.,С.В.Рублеўскі.Выдавецтва УПП «Віцебская абласная друкарня»2010.

11.А.В.Жыбуль.Глыбоччына.Выдавецтва УП «БЕЛТА»,2014.

Інтэрнэт-рэсурс:

http://pikoclub.ru/stati/istoriya-razvitiya-vyazaniya-kryuchkom-i-spitsami-v-rossii/

https://ru.wikipedia.org/wiki/%D

http://docsyg.ru/istoriya-vozniknoveniya-vyazaniya/

https://knittochka.ru/vyazanie-kryuchkom/istoriya-vozniknoveniya-vyazaniya-kryuchkom.html

https://www.perunica.ru/etnos/7168-posidelki.htmlhttps://sites.google.com/site/zacemvnasvekrukodelie/iskusstvo-vazania

http://my-crochet.ru/istoriya-vyazaniya.html










**Творчы праект «Лялька.бай»**

*Шпакова Оксана Андреевна,методист*
*Пачковская Ирина Владимировна,*
*педагог дополнительного образования*

**Актуальнасць праекта.**

Напэўна, у цэлым свеце няма персанажаў дзіцячых цацак больш



унікальных і старажытных, чым лялькі. На стаянках першабытных людзей, у Пампеі, якая засыпана попелам, у замках сярэднявечных прынцэс і рыцараў, у хатах простых сялянскіх сем'яў і палатах англійскіх каралей - археолагі да сённяшняга дня адшукваць іх паўсюль. У кожным часу розныя народы выраблялі і ўкладвалі ў сваіх лялек уласнае бачанне, часта надзяляючы іх магічнымі магчымасцямі і ўласцівасцямі, але, разам з гэтым, яны ўсё роўна былі і заўсёды застануцца самымі любімымі цацкамі дзяцей.

Сучасныя гульні ў дзіцячыя лялькі даволі-такі моцна адрозніваюцца сваім разнастайнасцю і вялікімі магчымасцямі, чым гэта было, параўнальна нядаўна, усяго толькі пару дзесяткаў гадоў таму. Вітрыны практычна ўсіх крам цацак проста валяцца ад прыгожых лялечных персанажаў, якія прызначаны для самых разнастайных роляў, узростаў і гульняў. Здавалася б усё! Што тут яшчэ можна прыдумаць? Але гурткоўцы Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна» ўсё ж знайшлі невялічкую нішу для сваёй задумкі ў гэтым напрамку і распрацавалі праект пад назвай «Лялька.Бай».

*Мэта праекта* : выраб беларускіх лялек з музычным суправаджэннем на беларускай мове (Сплюша-спявае калыханкі, Казачніца-распавядае казкі, Весялінка-спявае беларускія народныя песні).

*Задачы:*

-выраб цацкі-лялькі з беларускім маўленнем; (лялька Сплюша-спявае беларускія калыханкі,лялька-Казачніца-распавядае казкі, лялька-Весялінка -спявае беларускія народныя песні).
- далучэнне дзяцей і падлеткаў да вытокаў беларускай культуры;
- пашырэнне ведаў пра беларускі фальклор;
- фарміраванне маўленчых здольнасцей дзяцей;
- выхаванне творчай асобы.

*На каго накіраваны праект:*

Дзеці малодшага і сярэдняга ўзросту.

*Удзельнікі:*

Педагогі дадатковай адукацыі, гурткоўцы аб’яднаннняў па інтарэсах «Дэкаратыўны дызайн» кір.Пачкоўская Ірына Уладзіміраўна, узорны тэатр моды «Аліса» кір.Шпакава Аксана Андрэеўна ДУДА «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна», бацькі.

*Тэрмін рэалізацыі праекта:*

Верасень 2019-красавік 2020 года.

*Этапы рэалізацыі праекта:*

*1 этап падрыхтоўча-арганізацыйны:*

-знаёмства удзельнікаў праекта для далейшай працы;

-наведванне бібліятэкі,гісторыка-этнаграфічнага музея ў г.Глыбокае;
-распрацоўка праекта.

*2 этап – практычны:*

- рэалізацыя асноўных напрамкаў дзейнасці па рабоце праекта;
- азнаямленне дзяцей з гісторыяй і значэннем лялькі ў жыцці чалавека;
- падбор музычнага напаўнення для лялек;
- падбор казак для напаўнення лялькі;
- выраб з дзецьмі лялек.

*3 этап заключны:*

- прэзентацыя навучэнцамі пошукава-даследчага праекта.

*Асноўныя віды дзейнасці ў праекце:*

- творчы;
- гульнёвы;
- пошукава-даследчы.

*Месца рэалізацыі:*

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна».

*Пажаданыя вынікі:*

– выраб цацкі-лялькі з беларускім маўленнем; (лялька Сплюша-спявае беларускія калыханкі, лялька-Казачніца - распавядае казкі, лялька-Весялінка - спявае беларускія народныя песні).
– далучэнне дзяцей і падлеткаў да вытокаў беларускай культуры;
– пашырэнне ведаў пра беларускі фальклор;
– фарміраванне маўленчых здольнасцей;
– выхаванне творчай асобы;
– захаванне нацыянальных традыцый;

захаванне спадчыны і выкарыстанне яе ў выхаванні і фарміраванні асобы падрастаючага пакалення.

План работы ў праекце

| №пп | Мерапрыемства | Дата |
|---|---|---|
| 1. | Гульнёвы трэнінг «Давайце знаёміцца» Знаёмства ўдзельнікаў праекта. | верасень |
| 2. | Распрацоўка праекта | верасень |
| 3. | Наведванне бібліятэкі,гісторыка-этнаграфічнага музея ў г.Глыбокае; | кастрычнік |
| 4. | Экскурсія у Дом рамёстваў - знаёмства з майстрамі па вырабу лялек. | кастрычнік |

| | | |
|---|---|---|
| 5. | Праслухоўванне і падбор музычнага напаўнення(беларускія песні і калыханкі) для лялек;<br>Чытанне і падбор казак для напаўнення лялькі. | лістапад |
| 6. | Творчая праца па вырабу лялек | Кастрычнік-лістапад |
| 7. | Афармленне праекта і мультымедыйнай прэзентацыі. | лістапад |
| 8. | Апрабацыя лялек :<br>- у дашкольных установах горада;<br>-у Школе ранняга развіцця ДУДА «Цэнтра дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна»;<br>-у пачатковых класах устаноў адукацыі горада Глыбокае. | лістапад |
| 9. | Прэзентацыя праекта на метадычным аб'яднанні педагогаў дадатковай адукацыі. | лістапад |
| 10. | Прэзентацыя праекта на занальным, абласным,рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі» | Лістапад-сакавік |

## Асноўная частка праекта

Некалькі слоў пра праект «Хараство глыбоцкіх прыгажунь». Яго мэта-фарміраванне ў навучэнцаў цікавасці да гісторыі і культуры беларускага народа праз выяву традыцыйнай народнай лялькі. А асноўныя **задачы:**

1.Пазнаёміць дзяцей з гісторыяй узнікнення народнай лялькі і яе асаблівасцямі.

2. Вывучыць асаблівасці беларускага и глыбоцкагастрою касцюма.

3. Вырабіць ляльку ў народным касцюме глыбоцкага ладу.

Нехта з вас падумаў-навошта мы пра гэта расказваем? А вось для чаго. Працуючы над праектам мы зрабілі вельмі вялікую пашукова-даследчую працу-былі і у музеях,і ў бібліятэках,знаёміліся з гісторыяй узнікнення лялькі,беларускага касцюма,касцюма глыбоцкага строю,і шмат размаўлялі з бацькамі,бабулямі,прымалі ўдзел у майстар-класах і інш. Вынікам той працы сталі выраб лялек у касцюмах глыбоцкага строю,а таксама выраб калекцыі адзення «Глыбоцкія прыгажуні». Такім чынам атрыманы намі матэрыял у даследніцкай дзейнасці стаў добрым падмуркам для новага праекта «Лялька.Бай».

У новым праекце «Лялька.Бай» на аснове даследчай працы мы вырашылі нашым лялькам надаць новую «ролю» - цяпер яны стануць не сувенірам ці экспанатам выставы, а добрым сябрам дзіцяці, калі-некалі змяніўшы матулю, якая праспявае калыханку, ці бабулю-расказаўшы казку, ці

нават сяброўка, з якой можна праспяваць беларускія народныя песні. Акрамя таго такая лялька  адыграе вялікую ролю ў выхаванні любові да Радзімы, яе спадчыны, беларускай мовы, а у дадзеным выпадку –і да беларускага фальклору.

Першым крокам праекта з'яўляецца аб'яднанне ў творчую групу дзвюх аб'яднанняў па інтарэсах - «Дэкаратыўны дызайн» і узорны тэатр моды «Аліса», правядзенне трэнінга на знаёмства. Ад гэтага будзе залежыць якасць работы ў праекце. Наступным мерапрыемствам стане распрацоўка і састаўленне плана работы ў ім. На гэтым этапе важным з'яўляецца і раздяленне відаў дзейнасці паміж удзельнікамі, каб усім не прыйшлося рабіць адное і тое ж. Такім чынам прапануецца выраб лялек даручыць аб'яднанню па інтарэсах

«Дэкаратыўны дызайн», ўзорнаму тэатру моды «Аліса» - музычнае напаўненне лялек. А прэзентацыя, апрабацыя і ўдзел у конкурсах - сумесная работа гурткоў.

Наступны этап - творчая праца па вырабу лялек. Тут і распрацоўка выкрайкі, падбор матэрыялу, пашыў цацак, іх упрыгожванне, выраб каробкі для кожнай лялькі, размалёўка твару.

Наступным этапам правядзенне апросу сярод дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту - каму якія казкі, калыханкі, беларускія песні падабаюцца. Гэта патрэбна для папаўнення музычнага афарбавання лялек, якое будзе перадавацца праз  партатыўную міні-калонку. Міні-калонка размешчваецца ўнутры лялькі.

На завяршальным этапе праводзім апрабацыю ляляк у дзіцячых калектывах: Праект «Лялька.Бай» з'явіўся не спантанна,а як працяг пашукова-даследчага праекта «Хараство глыбоцкіх прагажунь», які быў рэалізованы аб'яднаннямі па інтарэсах «Дэкаратыўны дызайн» і ўзорны тэатр моды «Аліса».Трэба дадаць, што праект «Хараство глыбоцкіх прыгажунь» быў адзначаны дыпломам 1 ступені абласнога і дыпломам Нацыянальнага цэнтра дзяцей і моладзі ў межах рэспубліканскага конкурсу пошукова-даследчых работ «Выхаванне на аснове традыцый беларускага народа. Беларуская народная цацка.»школе ранняга развіцця ЦдіМ, дашкольных установах горада, пачатковых класах устаноў адукацыі. Акрамя таго прадугледжаны ўдзел праекта «Лялька.Бай» у занальным, абласным, рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі».

Праект «Лялькі.Бай» ажыццяўляўся ў аб'яднаннях па інтарэсах "Дэкаратыўны дызайн", узорны тэатр моды «Аліса» ў творчым тандэме навучэнцаў, педагогаў і бацькоў. Праект рэалізоўваўся па састаўленаму плану.

Такім чынам, наш праект прадстаўлены трыма цацкамі-лялькамі, вырабленымі з тэкстылю. Лялька Сплюша мае вобраз дзяўчынкі, якая спіць, і пры ўключэнні музычнага суправаджэння спявае калыханкі, песенькі. Лялька Весялінка мае вобраз прыгожай і вясёлай дзяўчынкі, якая спявае весёлые песенькі. Лялька дзед Баюн мае вобраз старога чалавека-дзядулі, які распавядае казкі для ўнукаў. У нашых лялек прыгожы знешні выгляд і прыгожыя вочы з добрай усмешкай. Іх хочацца трымаць у руках, гуляць і размаўляць з імі, слухаць і спяваць разам з імі. Кожная лялька мае прыгожую ўпакоўку, дэкараваную ўнутры і звонку ільняной тканінай, упрыгожаную тасьмой з беларускім арнаментам. Музычнае афармленне лялек забяспечваецца праз партатыўную калонку, якая знаходзіцца ўнутры выраба.

Удзел у такім праекце стаў важным для навучэнцаў у плане выхавання на нацыянальных традыцыях,у данным выпадку - фальклоры. Вялікую колькасць часу работы ў праекце надзялялася знаёмству з беларускай музыкай, калыханкамі, казкамі. Працуючы з дакументальнай і мастацкай літаратурай, кожны ўдзельнік праекта знайшоў для сябе шмат новага і карыснага. Вельмі пазнавальнымі сталі экскурсіі у Дом рамёстваў, дзе навучэнцы пазнаёміліся з майстрамі па вырабу лялек, паспрабавалі зрабіць іх самі. Добры вопыт атрымалі гурткоўцы ў пошукова-даследчай, а таксама ў праектнай дзейнасці. Атрыманы вопыт кожнаму з іх спатрабіцца ў далейшай вучэбнай дзейнасці.

Вельмі цікавым стаў творчы бок працы, бо ў ёй трэба было аб’яднаць увесь сабраны матэрыял, выбраць неабходны, важнейшы, адаптаваць да сябе і потым увасобіць у выкананні лялек .

Супрацоўнічаючы ў рэалізацыі праекта з Глыбоцкай раённай бібліятэкай, Глыбоцкім Домам рамёстваў, Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеем, навучэнцы атрымалі добры прыклад таму, як трэба любіць і шанаваць сваю гісторыю, традыцыі. Кожны з дзяцей бачыў з якім натхненнем, любоўю дарослыя распавядалі пра музейныя экспанаты, пра культуру, побыт, пра гісторыю беларускага народа. А дарослыя, у сваю чаргу, бачылі гэтую недпаддзельную цікавасць дзяцей у пошукова-даследчай дзейнасці. Кожны ўдзельнік атрымаў самыя найлепшыя ўражанні ад выніка - вырабленых лялек, якія спяваюць беларускія песні, калыханкі, расказваюць казкі.

Дадзеная работа ў праекце атрымала добрую адзнаку.Творчы праект «Лялька.Бай» быў прэзентаваны ў ДУДА «Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна» на занальным этапе рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», на рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі», Дні

беларускага Брэнда ў Віцебску, Дні моладзі ў межах «Славянскага базару ў Віцебску»,Дні моладзі ў межах Міжнароднага фэсту «Вішнёвы фестываль у Глыбокім»,Віцебскім абласным форуме моладзі і інш.

На дадзены час лялькі, выраблены па праекту «Лялька.Бай» не маюць аналагаў.
















## Пионерская инициатива «Мама, папа, я – пионерская семья»

*Шпакова Оксана Андреевна, методист*
*Михасёв Кирилл, учащийся 9класса ГУО «СШ №2 г.Глубокое»*

### Введение




Пионерская инициатива «Мама, папа, я – пионерская семья» разработана с целью знакомства родителей с деятельностью Общественного объединения «Белорусская республиканская пионерская организация» на современном этапе и её популяризации. Достижение поставленной цели будет решаться посредством проведения пионерских мероприятий различной направленности с активным участием родителей.

Ожидаемым результатом станет:

-привлечение внимания общественности к деятельности ОО «БРПО»;
-популяризация пионерского движения в районе, создание положительного имиджа организации;

-увеличение численности членов ОО «БРПО» в пионерской дружине.

Данный материал адресован методистам, педагогам организаторам, работающим с детскими общественными объединениями.

Ключевые слова: пионерская организация, имидж, деятельность, родители, результат.

## Содержание проекта

Белорусская республиканская пионерская организация – одно из самых массовых детских объединений в стране. Маленькой частичкой Белорусской республиканской пионерской организации является и Глубокская районная пионерская организация. С каждым годом Глубокская районная пионерская организация пополняется активными, инициативными, креативными и талантливыми ребятами. Сегодня численность членов ОО «БРПО» в Глубокском районе составляет 2340 учащихся. Это составляет 78% от общего количества учащихся в районе. А соответственно есть ещё потенциал для пополнения пионерской организации. Педагоги-организаторы, классные руководители проводят достаточную работу по знакомству учащихся с деятельностью ОО «БРПО». Но, исходя из диагностики и полученных данных работы с родителями в данном направлении стало ясно, что они не достаточно владеют информацией о деятельности ОО «БРПО». 70% владеют информацией об ОО «БРПО»,20% - слышали, что есть такая организация, но не вникали в суть ее деятельности, 10%-не знают о деятельности пионерской организации.

На основе полученных данных и был разработан проект «Мама, папа, я -пионерская семья». Его апробация проходит в пионерских дружинах учреждений образования Глубокского района.

Цель проекта: знакомство родителей с деятельностью ОО «БРПО» на современном этапе и её популяризация.

Задачи:

-знакомство родителей с деятельностью ОО «БРПО»;

-организация продуктивной совместной деятельности всех участников проекта взрослых лидеров, родителей, членов ОО «БРПО»;

-развитие творческих способностей, коммуникативной культуры, самодеятельности членов Общественного объединения «Белорусская республиканская пионерская организация» в совместной деятельности с родителями, взрослыми лидерами;

-привлечение внимания общественности к деятельности районной пионерской организации;

-создание положительного имиджа Глубокской районной пионерской организации.

Целевая группа проекта: учащиеся и родители учащихся учреждений образования Глубокского района

Территория реализации: Глубокский РС ОО «БРПО»

Период реализации: август 2018-май 2020г.

Этапы реализации:

1. Организационный (август 2018) - работа над проектом, разработка стратегии» действий;

2. Практико-реализующий (сентябрь 2018 – май 2020) - работа по проекту, мониторинг промежуточных результатов реализации проекта; 3.Обобщающий (май – 2 половина месяца) – анализ достижения поставленных целей и задач, интерактивный мониторинг эффективности реализации проекта, определение нерешённых проблем, результатов и успехов проекта.

Механизм реализации проекта:

Проект реализуется посредством проведения пионерских мероприятий различной направленности с непосредственным участием родителей. Вся работа с родителями делится на блоки: информационно-рекламный - «Агит-пионерия», массовая работа- «Мама, папа, я – пионерская семья», социально-значимые дела

- «Если не мы, то кто же», исследовательская деятельность «Пионерская история моей семьи».

По результатам участия в проекте создается рекламный видео-ролик «Мама, папа, я – пионерская семья».

*1 блок мероприятий - «Агит-пионерия»* включает в себя следующие формы работы:

-выступление педагога организатора на школьном родительском собрании с темой «Белорусская республиканская пионерская организация на современном этапе»;

-размещение информационных материалов о деятельности БРПО на школьных стендах, сайте учреждения образования;

-рекламная кампания «Пионерия вчера, сегодня, завтра…»;

-изготовление рекламных буклетов, листовок, банеров;

-демонстрация мультимедийной презентации деятельности районной пионерской организации на школьном родительском собрании;

-освещение пионерских мероприятий в СМИ, сайтах отдела по образованию, школьном сайте, группе ВК «Пионерия Глубоччины».

*2 блок мероприятий - «Мама, папа, я – пионерская семья»* включает в себя следующие формы работы (совместные-дети-родители):

- торжественный сбор «День рождения БРПО» (с приглашением родителей и выступлением их с приветственным словом);

- семейная игра-квест «Пионерский марафончик»;

-приём в октябрята «Путешествие по Октябрятии» (работа родителей на творческих станциях);

-интеллектуальная игра «Пионерский квиз»; (дети – родители);
-музыкальный конкурс «Песни нашего детства»;

-игровая программа «Игры нашего двора»;

-семейные спортивные эстафеты «Мама, папа, я - спортивная семья»;
-пешая экскурсия по городу - «Мой город - моя маленькая Родина»;

*3 блок мероприятий - «Если не мы, то кто же»*

Формы работы:

-благотворительная акция «Чудеса на Рождество»;

-благотворительная акция «Новая жизнь в обмен на крышечки»;
-экологическая акция «Чистый двор», «Чистый город»;

-трудовая акция «Обелиск»;

-благотворительный концерт «Лучики надежды».

*4 блок мероприятий - «Пионерская история моей семьи»* (поисково исследовательская работа в семейных архивах)

-выставка фотографий «Добрый взгляд с пионерского прошлого»;

-поисково-исследовательская конференция «Пионерская история моей семьи»;

-конкурс исследовательских работ «Пионерская история моей семьи»;

-конкурс видеороликов «Пионерское детство моих родителей».

*Ожидаемые результаты*

-знакомство родителей с деятельностью ОО «БРПО», с деятельностью Глубокской районной пионерской организации;

-активное участие членов ОО «БРПО» и родителей в мероприятиях проекта;

-привлечение внимание общественности к деятельности ОО «БРПО»;

-популяризация пионерского движения в районе, создание положительного имиджа организации;

-увеличение численности членов ОО «БРПО» в пионерской дружине.














Литература

1. Детское движение.- Мн.: Изд. ООО «Красико-Принт», 2004.- (Деятельность классного руководителя).

2. Под знаком пионерского содружества. /Под ред. Орловой Л.Н.-Орёл,200 3. Иванов И.П. Энциклопедия КТД.-М.: «Педагогика», 1989.

4. Зарахович, И.С., Пионерское поручение. /И.С.Зарахович, Трухачёва Т.В. -Библиотечка пионера активиста. М., Молодая гвардия,1984.

5. Кашлев ,С.С. Современные технологии педагогического процесса. С.С.Кашлев.-Пособие для педагогов. Мн., Вышэйшая школа, 2002.

6. В помощь педагогу-организатору.- Мн., Изд.ООО «Красико-принт», 2004.

7. Кабуш,В.Т. Самоуправление. /В. Т. Кабуш.- Белый ветер, 1999.